# Жанна Барысаўна Шкурдзюк

З Вікіпедыі, свабоднай энцыклапедыі

**Жанна Барысаўна Шкурдзюк** (1955, Мінск) — беларуская дзяржаўная дзеячка, намеснік Старшыні Вярхоўнага Суда Рэспублікі Беларусь (з 2003).

| **Жанна Барысаўна Шкурдзюк** | |
|---|---|
| **Нараджэнне** | 1955<br>Мінск, БССР, СССР |
| **Адукацыя** | юрыдычны факультэт БДУ (1985) |
| **Дзейнасць** | суддзя |
| **Узнагароды** | Ганаровая грамата Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь (1997)<br>Падзяка Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь[d] (2003) |

## Біяграфія

Нарадзілася ў 1955 годзе ў Мінску. Прафесійную дзейнасць пачала ў 1978 годзе з пасады сакратара судовага пасяджэння суда Кастрычніцкага раёна Мінска.

У 1985 годзе скончыла юрыдычны факультэт Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта па спецыяльнасці «Правазнаўства» і была прызначана суддзёй суда Савецкага раёна Мінска. З 1991 па 2000 год працавала на пасадзе суддзі Мінскага гарадскога суда, пасля чаго была прызначана суддзёй Вярхоўнага Суда Рэспублікі Беларусь.

23 снежня 2003 года прызначана намеснікам Старшыні Вярхоўнага Суда Рэспублікі Беларусь[1]. З'яўляецца старшынёй судовай калегіі па справах інтэлектуальнай уласнасці Вярхоўнага Суда Рэспублікі Беларусь.

Мае вышэйшы кваліфікацыйны клас (2004).

## Ацэнка дзейнасці

Пасля фальсіфікацыі прэзідэнцкіх выбараў 2020 года і жорсткага падаўлення пратэстаў рэжымам Аляксандра Лукашэнкі, у верасні 2020 года трапіла ў санкцыйныя спісы краін Балтыі (Латвія, Літва, Эстонія)[2][3][4]. Змешчаная ў базу грамадскай ініцыятывы «Народны трыбунал» за парушэнне артыкула 392 Крымінальнага кодэкса Беларусі і шматразовыя парушэнні Канстытуцыі Беларусі, Кодэкса аб адміністрацыйных парушэннях, Працэсуальна-выканаўчага кодэкса[5].

## Узнагароды

- ганаровая грамата Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь (1997),
- падзяка Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь (2003),
- ганаровае званне «Заслужаны юрыст Рэспублікі Беларусь» (2013),

- нагрудны знак «За адданасць правасуддзю» (2015).

## Зноскі


1. Указ Президента Республики Беларусь от 24 декабря 2003 года № 592 «О назначении Ж. Б. Шкурдюк заместителем Председателя Верховного Суда Республики Беларусь» (https://pravo.by/pdf/2004-1/2004-1(006-028).pdf)
2. Список белорусских чиновников и иных лиц, которым запрещен въезд в страны Балтии (http://belapan.com/archive/2020/09/26/eu_1061513/) (руск.). belapan.com (26 верасня 2020). Праверана 16-3-2021. (недаступная спасылка)
3. Latvia sanctions 101 more Belarus officials (https://eng.lsm.lv/article/politics/diplomacy/latvia-sanctions-101-more-belarus-officials.a375733/)
4. The sanctions of the Government of the Republic in view of the situation in Belarus (https://vm.ee/en/sanctions-government-republic-view-situation-belarus)
5. Шкурдюк Жанна Борисовна (https://narodnyj-tribunal.info/en/betrayers/356). Архівавана (https://web.archive.org/web/20210316163605/https://narodnyj-tribunal.info/en/betrayers/356) з першакрыніцы 16-3-2021. Праверана 16-3-2021.


Узята з "https://be.wikipedia.org/w/index.php?title=Жанна_Барысаўна_Шкурдзюк&oldid=4050170"